Жыве Беларусь!

Народная газета

Орган Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

№87 (852) 18 мая 1994 г. Серада. Выдаецца з кастрычніка 1990 года на беларускай і рускай мовах. Тыраж 619505 экз. Кошт у розніцу — 100 руб.

ФАКС

Вкратце

Сергей Шахрай объявил, что уходит с поста вице-премьера России.

Вчера на пресс-конференции он заявил, что этот шаг вызван тем, что с ним никто не проконсультировался по поводу назначения нового министра по делам национальностей.

❑

Переговоры по урегулированию карабахского конфликта в Москве вчера были прерваны.

Стороны так и не подписали окончательное соглашение о прекращении огня, сославшись на необходимость проконсультироваться со своими правительствами.

❑

Госсекретарь США Кристофер вчера посетил Иерихон — столицу региона, где вводится режим палестинской ограниченной автономии, и обещал международную поддержку этому региону.

США обязались в течение пяти лет предоставить 500 миллионов долларов в помощь новой палестинской автономии.

❑

Вчера в Южном Йемене шли интенсивные бои в 60 километрах от столицы этого государства.

❑

Румыния намерена оказать содействие в создании таможенного коридора, который ускорит доставку продовольствия в Македонию, оказавшуюся в частичной изоляции из-за санкций, введенных ООН против Сербии и Черногории.

Поставки начнутся в конце текущего месяца.

❑

В конце этого учебного года в Приднестровье будут закрыты три последние школы, в которых преподавание ведется с использованием латинского шрифта.

С сентября школы перейдут на русский алфавит.



Рисунок Олега ПОПОВА.

Дежурная часть

Районный центр Червень сотряс взрыв.

В двухэтажном здании народного суда в кабинете судебных исполнителей, где сработало взрывное устройство, выбиты стекла, повреждены мебель, пол. Причина происшествия устанавливается.

❑

Сотрудниками отдела по борьбе с организованной преступностью Министерства внутренних дел Беларуси по Минску и области проведена успешная операция.

В личной автомашине "Форд-Гранада" задержаны во время сбыта наркотического вещества гражданин Народной Республики Бенин Ахун Ноэль Эммануэль Абиодун и житель Махачкалы Р. Богомедов.

У них изъято 505 граммов героина.

Дмитрий КУРАСОВ.

Спорт-экспресс

В очередных матчах чемпионата Беларуси по хоккею гродненский "Неман" дважды победил минское "Торпедо" — 7:3 и 7:0, а новополоцкий "Химик" одержал верх над минской "Юностью" — 4:1 и 8:3.

❑

Бобруйчанка Елена Пискун завоевала серебряную медаль в опорном прыжке на чемпионате Европы по спортивной гимнастике, который проходил в Стокгольме.

❑

Минчанка Наталья Зверева и американка Джиджи Фернандес вновь стали победителями в парном разряде — на сей раз в финале открытого теннисного чемпионата Германии.

❑

Мужская сборная Беларуси по самбо стала в командном зачете бронзовым призером Кубка мира, который проходил в Нижегородской области.

Студентам дорога за границу заказана

Как сообщили в отделе студенческих отрядов Службы занятости молодежи и студентов Беларуси, этим летом подзаработать в студенческих отрядах смогут 2830 человек.

Из них в Ставрополь поедет 1000 человек, в Молдову — 1100, в Тюмень — 400, в Мурманскую область — 80. Проводниками во время летних каникул выразили желание работать 250 девушек и юношей.

И еще одна новость — правда, не из лучших: в этом году приходится отказаться от практики формировать студенческие отряды для отправки на работу за границу.

Годовой отчет — по нотам

С отчетным концертом в честь пятидесятилетия освобождения города от немецко-фашистских захватчиков выступили перед земляками преподаватели и воспитанники Витебского музыкального училища имени И.Соллертинского.

Они продемонстрировали свое мастерство в зале областной филармонии.

Сергей ЦЫМБАЛИСТОВ.

Где стал на коньки чемпион?

Знаменитый белорусский спортсмен Игорь Железовский стал почетным гражданином Орши.

Это первый спортсмен, который по решению исполкома встал в одну шеренгу с местными знаменитостями и героями-освободителями. Родной город, где будущий олимпиец научился кататься на льду, ждет встречи со своим питомцем.

Сергей ДВИНСКИЙ.

По Сеньке и шапка?

Состоялись заключительные матчи 24-го тура Национального чемпионата Беларуси по футболу.

Вот их результаты: "Фандок" — "Динамо"/Мн/ — 1:2, "Днепр" — "КИМ" — 2:0, "Шахтер" — "Шинник" — 0:1, "Гомсельмаш" — "Локомотив" — 0:3, "Динамо"/Бр/ — "Ведрич" — 1:0.

Положение команд после 24-го тура

	И	В	Н	П	М	О
Динамо Мн	24	18	4	2	57—17	40
Динамо-93	24	16	6	2	38—10	38
Днепр	24	14	5	5	36—15	33
КИМ	24	13	7	4	26—13	33
Молодечно	23	10	6	7	30—23	26
Торпедо Мн	24	6	13	5	13—13	25
Шинник	24	11	2	11	31—29	24
Фандок	24	9	6	9	22—19	24
Динамо Бр	24	7	8	9	18—24	22
Торпедо Мг	24	5	9	10	14—29	19
Локомотив	24	5	9	10	18—34	19
Гомсельмаш	24	7	4	13	33—38	18
Неман	23	6	6	11	23—33	18
Шахтер	24	4	9	11	17—31	17
Ведрич	24	4	7	13	14—29	15
Строитель	24	3	5	16	11—44	11

Выпуск подготовлен по сообщениям корреспондентов "Народной газеты", агентств ИТАР—ТАСС, Белинформ, Интерфакс, БелаПАН

Пульс прэзідэнцкай кампаніі

Апарат як сродак заваёвы пасады прэзідэнта

Сяргей ПЛЫТКЕВІЧ

Сталі вядомыя папярэднія даныя абкольkасці сабраных галасоў за асноўных прэтэндэнтаў на пасаду прэзідэнта Беларусі па гарадах і раёнах рэспублікі. Даныя гэтыя вельмі цікавыя і даюць пэўную падставу для разважанняў.

Такім чынам, больш за ўсіх галасоў у сваю падтрымку набраў прэм'ер-міністр Беларусі Вячаслаў Кебіч. За яго выказаліся не толькі 203 дэпутаты, але і каля чатырохсот тысяч выбаршчыкаў. Унушальныя лічбы, але яны добра зразумелыя, калі ўлічыць тое, што вельмі актыўную работу па збору подпісаў праводзілі работнікі дзяржаўнага апарату. Сведчанняў гэтага столькі, што зараз няма сэнсу называць асобныя факты. Яны ёсць і ў рэдакцыі нашай газеты, і ў іншых рэдакцыях, і ў грамадскай кантрольнай камісіі, ды і старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах прэзідэнта Аляксандр Абрамовіч у гутарцы з намі прызнаў той факт, што дзяржаўны апарат прымае ўдзел у перадвыбарчай барацьбе.

Аднак узнікае пытанне: добра гэта ці дрэнна? Ці можа дзяржаўны апарат быць па-сапраўднаму дэпалітызаваным і выконваць толькі сваю, так званую функцыю сацыяльнага кіравання? На гэта пытанне існуюць розныя пункты гледжання. Нават у краінах старых дэмакратычных традыцый дзяржаўны апарат знаходзіцца пад пэўным уплывам той партыі, якая ўтрымлівае ўладу. Што ўжо казаць пра дзяржавы, якія пераходзяць фактычна ад адной палітычнай сістэмы да другой. У гэтых дзяржавах роля апарату кіравання страшэнна ўзрастае. І вынікі першага этапа прэзідэнцкай кампаніі на Беларусі гэта толькі пацвярджаюць. Прэм'ер-міністр Беларусі Вячаслаў Кебіч, на якога працаваў дзяржаўны апарат, набраў найбольшую колькасць галасоў. А інакш і быць не магло, бо прыход да ўлады іншых прэтэндэнтаў нёс пэўную пагрозу для многіх работнікаў і Савета Міністраў, і аблвыканкамаў, і райвыканкамаў.

У адным з папярэдніх матэрыялаў мы пісалі, што толькі Старшыня Вярхоўнага Савета Беларусі Мячэслаў Грыб мог змяніць гэтую сітуацыю, калі б рызыкнуў пазмагацца за пасаду прэзідэнта. Тады б работнікам выканаўчых структур прыйшлося б выбіраць паміж ім і Кебічам. Аднак Мячэслаў Іванавіч не рашыўся на такі крок. І чыноўнікам нічога не заставалася, як працаваць на Кебіча. Выключэннем, падкрэслім, вельмі цікавым і характэрным, стаў толькі горад Маладзечна. Як вядома, мэр Маладзечна Генадзь Карпенка сам балаціруецца на пасаду прэзідэнта. І выканкам Маладзечанскага гарсавета, зразумела, на Кебіча не працаваў. Вынік вельмі цікавы: за прэм'ер-міністра Беларусі Вячаслава Францавіча Кебіча, па папярэдніх даных, у горадзе Маладзечна — 0 (ноль!) выбаршчыкаў. Вось вам роля дзяржаўнага апарату ў палітычнай барацьбе!

Дарэчы, тое ж самае можна гаварыць і пра ролю моцных партыйных структур. Скажам, Беларускі народны фронт, які ўжо мае добры вопыт у зборы подпісаў і адданых прыхільнікаў у многіх гарадах рэспублікі, змог сабраць у падтрымку свайго лідэра Зянона Пазьняка больш за 230 тысяч галасоў. Вызначылася арганізаванасцю і Партыя камуністаў Беларусі, якая набрала ў падтрымку сакратара ЦК ПКБ Васіля Новікава амаль дзвесце тысяч галасоў. Цяжэй прыйшлося тым кандыдатам, каго падтрымлівалі нешматлікія і неўплывовыя партыі або ненадзейныя саюзнікі. Так, колькасць подпісаў, сабраных у падтрымку Генадзя Карпенкі, ледзь-ледзь перавысіла сто тысяч. І калі б у яго не было 79 подпісаў дэпутатаў, то зараз Генадзю Дзмітрыевічу прыйшлося б вельмі пахваляваца. Зразумела, наперадзе ва ўсіх прэтэндэнтаў цяжкасцей яшчэ многа. Але мы ўсе павінны разумець, што толькі той кандыдат, які пераможа ў сумленнай барацьбе, зможа стаць сапраўдным прэзідэнтам краіны, з якім будуць лічыцца і пераможаныя ім апаненты. Але калі перамога будзе несумленнай, калі Цэнтральная камісія па выбарах прэзідэнта, паддаўшыся якому-небудзь уціску, паглядзіць скрозь пальцы на парушэнні закона, то абранне такога прэзідэнта толькі павялічыць супрацьстаянне ў рэспубліцы. І тады справа сапраўды можа дайсці да сацыяльнага выбуху.

Гомельчане симпатизируют Шушкевичу

Анатолий ГОТОВЧИЦ

Стали известны предварительные итоги сбора подписей граждан Гомеля за выдвижение претендентов на должность президента Беларуси. Как явствует из подписных листов, симпатии горожан отданы Станиславу Шушкевичу.

За него подписались почти 13 тысяч гомельчан. В инициативную группу по сбору подписей за экс-спикера парламента входили представители блока "Весна-94". В их числе и бывшие народные депутаты СССР от Гомеля Юрий Воронежцев и Виктор Корнеенко.

На втором месте по количеству подписей Вячеслав Кебич. Его желают видеть кандидатом в президенты 11,8 тысячи горожан.

За Зенона Позняка поставлено около шести с половиной тысячи подписей. Всего на какую-то сотню меньше подписей за Василия Новикова.

Остальные девять претендентов, включая Александра Лукашенко, получили значительно меньшее количество голосов. За шестерых из них в районные избирательные комиссии не передано ни одной подписи.

Что касается жителей Гомельского района, то препочтение здесь получил председатель колхоза "Прогресс" Гродненского района Александр Дубко. Уступили ему даже В.Кебич и В.Новиков. За А.Дубко поставлено полторы тысячи подписей.

Знай наших!

Очевидно, не зря называют Жлобин городом предпринимателей.

И не только потому, что к предпринимательской сфере здесь относят 10 процентов трудоспособных жителей. Сбор подписей за претендентов в президенты подтвердил репутацию Жлобина. Больше всего избирателей, попредварительным данным, подписалось за президента Союза предпринимателей Беларуси В.Карягина.

Правда, некоторые утверждают, что неожиданная популярность В.Карягина объясняется прежде всего тем, что в городе проживает вице-президент союза С.Скварчевский.

Анатолий ИВАНОВ.

Постановление Совета Министров Республики Беларусь

О кредитовании жилищно-строительных кооперативов

В связи с постановлением Президиума Верховного Совета Республики Беларусь от 13 апреля 1994 г. "О кредитовании жилищно-строительных кооперативов" Совет Министров Республики Беларусь **постановляет**:

1. Принять к сведению, что:

Национальный банк выделил Сберегательному банку 100 млрд. рублей для льготного кредитования жилищно-строительных кооперативов, дома которых подлежат вводу в эксплуатацию в первом полугодии 1994 г.;

Сберегательный банк направит в первом полугодии 1994 г. на указанные цели из своих ресурсов 140—150 млрд.рублей, а до конца текущего года — 40 процентов фактического прироста вкладов;

Белорусскому акционерному коммерческому промышленно-строительному банку и Белорусскому коммерческому банку реконструкции и развития предложено принять участие в кредитовании кооперативного жилищного строительства на льготных условиях в размере по 10 млрд. рублей, акционерным коммерческим банкам "Беларусь", "Приорбанк", "Дукат" и Банку внешнеэкономической деятельности — в размере по 5 млрд.рублей;

Национальному банку поручено уменьшить норму резервирования обязательных взносов Сберегательного банка с направлением этих средств на дополнительное финансирование кооперативного жилищного строительства.

Министерству финансов совместно с Национальным банком и иными банками определить порядок взаимных отношений при предоставлении жилищно-строительным кооперативам льготных кредитов.

2. Сберегательному банку до 1 июня 1994 г. обеспечить по договорам, заключенным до 1 января текущего года, льготное кредитование жилищно-строительных кооперативов, дома которых имеют высокую степень строительной готовности и подлежат вводу в эксплуатацию в первом полугодии 1994 г., за счет средств, выделяемых на эти цели Национальным банком и акционерными коммерческими банками, согласно приложениям 1 и 2.

Льготные кредиты указанным жилищно-строительным кооперативам предоставляются на условиях, определенных постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 22 марта 1993 г. номер 169 и постановлением Совета Министров Республики Беларусь и Национального банка Республики Беларусь от 10 мая 1993 г. номер 303/16.

3. Облисполкомам и Минскому горисполкому до 20 мая 1994 г. представить Сберегательному банку перечни подлежащих вводу в эксплуатацию в первом полугодии 1994 г. домов жилищно-строительных кооперативов, кредитование которых осуществляется по договорам, заключенным до 1 января текущего года, и совместно с ним обеспечить контроль за целевым использованием выделяемых кредитных ресурсов.

4. Министерству финансов совместно с Национальным банком предусмотреть компенсацию Сберегательному банку и акционерным коммерческим банкам расходов, связанных с предоставлением в 1994 году льготных кредитов на кооперативное жилищное строительство.

5. Пункт 6 постановления Совета Министров Республики Беларусь от 25 февраля 1994 г. номер 102 (СП Республики Беларусь, 1994 г., номер 7, ст. 85) после абзаца второго дополнить абзацем следующего содержания:

"Малоимущим гражданам, состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий на общих основаниях кредиты предоставляются по решению исполкомов городских и районных Советов депутатов на льготных условиях в размере до 90 процентов стоимости строительства дома (квартиры) на срок до 20 лет с погашением их со следующего года после получения и выплатой 20 процентов годовых за пользование ими. Кредит выдается Сберегательным банком при условии внесения в банк заемщиком средств в размере не менее 10 процентов сметной стоимости строительства дома (квартиры)".

6. Министерству финансов, Сберегательному банку и Министерству юстиции в мае 1994 г. подготовить для внесения в Верховный Совет Республики Беларусь предложения о дополнении Закона Республики Беларусь "О налоге на добавленную стоимость" положением о льготном налогообложении доходов, получаемых банками от размещения ресурсов для льготного кредитования кооперативного и индивидуального жилищного строительства.

7. Министерству экономики, Министерству финансов с учетом принятых решений о пересмотре перечня не начатых строительством объектов и объектов, сооружение которых не вызывается первоочередной необходимостью, финансируемых из республиканского бюджета, в недельный срок определить размер высвобождаемых средств и направить их Сберегательному банку для кредитования жилищно-строительных кооперативов во втором полугодии 1994 г.

Министерству финансов и Сберегательному банку до 1 июня текущего года установить порядок и условия использования указанных средств.

8. В целях изыскания дополнительных кредитных ресурсов для финансирования кооперативного жилищного строительства во втором полугодии 1994 г. министерствам и ведомствам до 1 июля текущего года организовать выплату заработной платы работникам центральных аппаратов и подведомственных предприятий и организаций безналичным путем через учреждения Сберегательного банка.

Рекомендовать облисполкомам и Минскому горисполкому в указанный срок провести аналогичную работу по предприятиям, организациям и учреждениям, подведомственным местным Советам депутатов.

Председатель Совета Министров Республики Беларусь В.КЕБИЧ.


Управляющий Делами Совета Министров Республики Беларусь Н.КАВКО.

14 мая 1994 г. г.Минск. N 338

Это было вчера

Михаил МЯСНИКОВИЧ:

"Если Шлындиков за дело берется, то у него, как правило, получается..."





Не случайно в заголовок вынесены слова первого заместителя премьер-министра республики М.Мясниковича. Он, пожалуй, как никто другой, правильно выразил мысль: если за дело берутся одержимые люди, результаты будут положительные. Представьте себе, лишь в декабре прошлого года был окончательно подписан договор между венгерским акционерным обществом "Икарус" и белорусским акционерным концерном "Амкодор", а уже спустя пять месяцев — новое детище: автобус "Икарус", собранный не в Будапеште, а в Минске.

Для поддержания автопарка республики на должном уровне, ежегодно нам необходимо примерно три тысячи новых автобусов. В сложившейся финансовой ситуации Беларусь не закупила у Венгрии за последние четыре года ни одной машины. Подвижнический шаг "Амкодора" — решение важнейшей проблемы Беларуси. Кстати, в республике осваивается производство нескольких модификаций автобусов. Но, судя по всему, "Амкодор" вместе с венгерской фирмой "Икарус" окажется в лидерах. Важно то, что Беларусь станет не сборочным цехом венгерской фирмы "Икарус", а ее равноправным партнером. Уже на автобусе, который вчера курсировал по Минску и бесплатно перевозил участников презентации, немало комплектующих белорусского производства, в том числе двигатель — сердце машины. В будущем до 80 процентов узлов и деталей будут производиться в Беларуси.

... 70 процентов автобусов, которые курсируют по маршрутам столицы, имеют эмблему венгерской фирмы "Икарус". Содружество ее с "Амкодором" вселяет уверенность в том, что проблема городских перевозок у нас будет успешно решена. Кстати, об этом вчера говорили на презентации нового автобуса первый заместитель премьер-министра республики М.Мясникович, председатель Госкомитета по внешнеэкономическим связям В.Радкевич, министр транспорта и коммуникаций С.Шкапич, заместитель председателя Минского горисполкома Г.Синкевич и многие другие. Если несколько дней назад "Народная газета" сообщала, что до конца года в Беларуси будет собрано 30 "Икарусов", то вчера уже называлась цифра почти вдвое превышающая — 50.

Что ж, пусть "Амкодор" + "Икарус" будет равняться общему белорусско-венгерскому успеху!

❑ *Настоящим праздником стал для "амкодоровцев" выпуск в город первого белорусско-венгерского "Икаруса";*

❑ *генеральный директор АО "Икарус" (Венгрия) Андрес Шамшен, президент концерна "Амкодор" (Беларусь) Василий Шлындиков и генеральный директор АО "Амкодор — Пинск" (именно в Пинске будут производиться белорусские "Икарусы") Михаил Парепко.*

Фото Сергея ГРИЦА.

Улада і народ

"Трэба аднавіць парушаныя эканамічныя сувязі"

"Калі будуць аднаўлены парушаныя эканамічныя сувязі, жыць стане намнога лягчэй", - так заявіў 16 мая на сустрэчы з рабочымі Смаргонскага завода аптычнага станкабудавання Старшыня Савета Міністраў Беларусі Вячаслаў Кебіч.

У размове з рабочымі прэм'ер адзначыў, што "на якія б грошы мы ні перайшлі, нам усё роўна патрэбна добрая канкурэнтаздольная прадукцыя. Без яе не будзе і зарплаты. Галоўнае для нас, каб кошт тавараў як у Расіі, так і Беларусі быў аднолькавы. Тады лягчэй будзе знаходзіць і рынкі збыту". Гэта ж думка прагучала пры сустрэчах і ў іншых працоўных калектывах: у Смаргонскім філіяле МТЗ, на вопытным заводзе "Нёман", Лідскім аўтарамонтным.

Асаблівае ўражанне пакінула ў Вячаслава Кебіча наведванне Лідскага піўзавода. Тут ужо сабрана некалькі беларускіх аўтобусаў тыпу "ЛІАЗ".

Завяршыўся першы дзень знаходжання кіраўніка беларускага ўрада ў Гродзенскай вобласці сустрэчай у Лідскім Доме афіцэраў з кіраўнікамі калгасаў і саўгасаў, аграпрамысловых прадпрыемстваў і службаў вобласці.

Другі дзень знаходжання на гродзенскай зямлі Старшыні Савета Міністраў рэспублікі Вячаслава Кебіча пачаўся з наведвання прадзільна-ніткавага аб'яднання. У яго цэхах панавала цішыня. З-за дэфіцыту сыравіны станкі тут працуюць у адну змену.

Выступаючы напярэдадні перад хлебаробамі вобласці і 17 мая перад кіраўнікамі прадпрыемстваў прамысловасці, будаўніцтва, транспарту і сувязі, кіраўнікамі ўпраўленняў і аддзелаў аблвыканкама, абласных службаў, старшынямі райгарвыканкамаў, прэм'ер адзначыў, што [illegible] хваробу грамадства можна вылечыць толькі пры стварэнні эканамічнага саюза з рэспублікамі былога Саюза і перш за ўсё з Расіяй. На яго думку, прастоі некаторых прадпрыемстваў Гродзеншчыны - вынік разарваных раней эканамічных сувязей.

У другой палове дня прэм'ер сустрэўся са служыцелямі каталіцкай і праваслаўнай канфесій, а таксама з актывам Саюза палякаў Беларусі.

Міхаіл ЖУРАВОВІЧ, Белінфарм.

Народная газета

Штрыхі да палітычнага партрэта

Нядаўна "Народная газета" надрукавала артыкул старшыні Чачэрскага раённага Савета народных дэпутатаў, дэпутата Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С.Зарэцкага. Як ён заклікаў галасаваць за Кебіча! Кожны прапагандуе свайго куміра. Але чаму ў газетах ні слова пра тых, хто супрацьстаіць цяпер маючым уладу? Чаму людзей не азнаёміць з біяграфіяй таго ж Пазьняка? Як і ў старыя застойныя часы, гульня ідзе ў адны вароты. Урад узурпіраваў друк, радыё, тэлебачанне і праводзіцца мэтанакіраваная агітацыя за аднаго чалавека...

Мікалай КАМЯНЕЦКІ, жыхар г. Мінска.

АД РЭДАКЦЫІ


Спадзяёмся, да "Народнай газеты" крытыка аўтара не адносіцца. Не паддаючыся прэсінгу якога-небудзь боку, мы імкнёмся ўсебакова інфармаваць чытачоў. Аб гэтым сведчыць і артыкул, які мы прапануем вашай увазе.

Невядомы Пазьняк

Уладзімір ПАДГОЛ

Шмат хто з чытачоў, што прачытаюць да канца артыкул, захочуць задаць пытанне: чаму менавіта "невядомы Пазьняк"? Чаму звычайныя факты з жыцця Пазьняка невядомыя шырокаму колу чытачоў? Справа ў тым, што ён надзвычай сціплы чалавек. Акрамя гэтага, для многіх высокіх чыноўнікаў рэспублікі дзейнасць Пазьняка — пагроза іх уладзе, таму яны лгуць, робяць паклёпы на ягоную дзейнасць і жыццё.

Аўтару гэтага артыкула пашчасціла выслухаць маці Пазьняка...



Што аб'ядноўвае гэтых розных па ўзросту і прафесіях людзей — народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава і дэпутата Рэспублікі Беларусь Зянона Пазьняка? Якія нябачныя сілы прыцягваюць мудраца — гонар нацыі і таленавітага палітыка — надзею Беларусі? Яны даволі часта сустракаюцца і вядуць нетаропкую гутарку. Галоўнай мэтай іх размоў, боль іх душы — лёс Радзімы. Лёс мільёнаў людзей, якія пакутуюць на гэтай зямлі. Лёс жывых хвалюе іх, як і лёс тых, хто загінуў за шчаслівае жыццё нашчадкаў, але так і не атрымаў ні годнай памяці, ні ўшанавання. Іх хвалюе лёс і тых, хто не нарадзіўся. Якая зямля чакае сыноў і дачок Беларусі XXI стагоддзя? Няўжо яна ўся — суцэльная чарнобыльская смяротная пляма, што распаўзаецца нябачнаю пачвараю па цудоўных прыгожых абшарах? "Хвалюе і тое, — кажа Быкаў, — што духоўны Чарнобыль паўзе па душах людзей".

Яны — незвычайныя юбіляры, і гэта аб'ядноўвае іх, Быкаву спаўняецца 70. Пазьняку — 50 гадоў. Быкаў нарадзіўся на Віцебшчыне, Пазьняк — на Гродзеншчыне, але абодва лічаць, што зямля родная ў іх адна, агульная.

Кожны з іх нараджаўся некалькі разоў. Маладзенькі лейтэнант Быкаў для баявых сяброў пахаваны быў у брацкай магіле пад Кіраваградам. Маці ўручылі афіцыйную пахавальную. "А я быў проста паранены", — расказвае Быкаў.

Першы раз Пазьняк ледзь не загінуў, яшчэ не з'явіўшыся на свет. У мястэчка Суботнікі, дзе жыла маці Зянона, прыйшлі фашысты і падпалілі яе хату. Ксёндз схаваў маці Зянона і яе суседак у склепе касцёла. Гітлераўцы ламаліся ў касцёл, узарвалі гранату пад дзвярыма, але дзверы вытрымалі, выратаваўшы сялянкам жыццё.

Другі раз лёс падараваў жыццё, калі прыслужнік фашыстаў прыставіў пісталет да жывата цяжарнай маці, але не стрэліў.

Бог даў хлопчыку шанс з'явіцца на свет, і ён нарадзіўся 24 красавіка 1944 года. І быў ахрышчаны ў мясцовым касцёле.

А праз 8 месяцаў загінуў яго бацька, які ваяваў у разведцы. Пад Катавіцамі загінула ўся разведгрупа.

Лёс Пазьняка — гэта лёс амаль кожнай сям'і на Беларусі. Дзядзька Ясь ваяваў з гітлераўцамі з 1941 года як камандзір танка, а ў 1945 годзе ва Усходняй Прусіі ў танк трапіў снарад, з полымя выскачылі падначаленыя, а ён, як сапраўдны камандзір, ратаваўся апошнім і загінуў. Другога сваяка — дзядзьку Янку фашысты вывезлі ў Германію, дзе і знішчылі. Так і засталіся яны з маці ўдваіх. Маці на ўсё жыццё зберагла вернасць каханаму мужу, мужнаму воіну — адна выхавала сына. Гэтая вернасць і любоў як спадчына перайшла да Зянона. Немагчыма было не любіць зямлю, за якую загінулі бацька і дзядзькі. "А любіць — гэта значыць ведаць тайну аблічча любімай, — кажа Пазьняк. — Ведаць і бачыць тое, што ніхто не бачыць і не ведае. Менавіта так лічыў вялікі рускі філосаф Бярдзяеў. І я з ім згодны".

Вось чаму гісторыя Беларусі ўсё мацней і мацней прыцягвала Зянона, пакуль не захапіла цалкам. Ён браў удзел у раскопках у розных кутках Беларусі. Дакопваўся да пластоў сярэднявечча, даследаваў тагачаснае жыццё. А галоўныя тайны ляжалі побач, у 30-х гадах нашага стагоддзя, пад Мінскам, у Курапатах. І калі ён спасцігнуў гэтую таямніцу, жах ахапіў яго. Як магло такое здарыцца?! Пакутлівыя пытанні. Людзі, якіх нарадзіла адна зямля, падзяліліся: адны сталі ахвярамі, другія — катамі. Як можна страляць у нявінных? Што за чума апанавала народ,ператварыўшы частку яго ў нелюдзей? Штурхала на вар'яцкія ўчынкі лжывая ідэалогія. Згодна з ёй людзей вялі да светлай будучыні, высцілаючы касцьмі і чарапамі шлях. Выбівалі мазгі з самых светлых галоў, ламалі рукі самым працавітым сялянам. Вось дзе была разгадка, і гэтая разгадка аб'ядноўвала Быкава і Пазьняка.

Юнацкая душа Пазьняка не магла спакойна суіснаваць з фальшывай мараллю і ідэалогіяй: яго некалькі разоў выключалі са школы за бунт супраць ілжы і фальшу. Яго некалькі разоў выключалі з інстытута. Таму што казаў праўду, тое, што думаў. Нават дысертацыю не далі абараніць на Беларусі, і дзякуючы шматлікім сябрам — сапраўдным навукоўцам з Расіі — ён бліскуча абараніў вынікі сваіх навуковых даследаванняў у Ленінградзе.

Горкая іронія шматпакутнай зямлі. Праўду пра Радзіму — не простае меркаванне, а навукова абгрунтаваную, не далі выказаць дома, яна гучала з Расіі. Дзякуючы рускім сябрам Быкава і Пазьняка.

Што агульнага ў гэтых людзей? Іх цесна звязвае праўда, і яны за яе пакутуюць усё жыццё.

Яны лічаць, што ў палітыку нельга гуляць. Адным казаць адно, другім — другое, падладжвацца. Яны ўпэўнены, што людзям заўжды трэба казаць праўду, якой бы горкай яна ні была і як бы балюча за гэта ні білі. І ў якое б нявыгаднае становішча пры гэтым ні трапіў той, хто шчыра выказваецца.

Творы Быкава — пра ісціну Вялікай Айчыннай вайны, пра сапраўдных герояў — радавых народнай арміі — узарвалі фальшывае ідэалагічнае балота афіцыйна дазволенага. Ён пісаў пра тое, як армейскія чэкісты губілі простых салдат, здзекаваліся з верных сыноў Радзімы, робячы ўласную кар'еру, а з сябе — герояў.

Ён пісаў пра простых працаўнікоў, якія, стаўшы салдатамі, на мяжы жыцця і смерці выяўлялі духоўную моц, якая дазваляла ім ахвяраваць сваім жыццём, уздымацца да боскіх вышынь.

За гэтую ягоную праўду, якая ўскалыхнула ўсіх удзельнікаў вайны, усіх грамадзян не толькі ў Беларусі — ва ўсім свеце, наменклатурная пачвара накінулася на таленавітага пісьменніка: яго кніжкі забаранялі, калечылі цэнзурай, яму пагражалі, ладзілі фізічную расправу. І калі ўсё гэта не дапамагло, пачалі паліваць брудам, ілгаць, пісаць паклёпы ад імя сялян і рабочых: "Мы гарбаціліся, а яны шкодныя кніжачкі папісваюць". А сёння, калі вось так знішчылі духоўную культуру, на Беларусі раптам завізгатала гідра: "Амаральнасць, разбэшчанасць, маладое пакаленне гіне..."

Што іх звязвае? Тое, што абодва лічаць: сёння прыйшоў час суда. Над ідэалогіяй і мараллю, пабудаванай на хлусні, крывадушнасці, кулях. Пачвара, якая знішчыла беларускую духоўнасць у чалавечых душах, павінна быць асуджана. Без суда не адбудзецца вызваленне чалавечых душ. Іх звязвае і тое, што лёс і Бог падтрымалі гэтых двух сыноў Беларусі дзеля надзвычайнай місіі, бо ведаў Бог пра наканаваныя Беларусі выпрабаванні, пра Чорную зорку Палын...

70 працэнтаў вынікаў выбуху чарнобыльскага рэактара — на Беларусі! За што? Не было ў свеце больш камуністычнай рэспублікі! Дык куды ж павінна была зрыгнуць смерць АЭС, пабудаваная датэрмінова да з'езда КПСС? Ні з адной нацыяй кіраўніцтва КПБ—КПСС не праводзіла такога жудаснага эксперыменту, як з беларусамі, утвараючы з іх "советский народ", вынішчаючы ўсё нацыянальнае... І вось два гэтыя эксперыменты камуністы правялі на Беларусі аднначасова. Датэрмінова пабудаваная станцыя з верным ленінцам-дырэктарам засыпала Беларусь атамнай смерцю. А камуністычнае кіраўніцтва Беларусі, у якое ўваходзіў Кебіч, засыпала Беларусь смяротнай хлуснёй, быццам бы небяспекі няма, што дзеткам нават карысна схадзіць 1 Мая на дэманстрацыю, падыхаць кактэйлем са стронцыю, цэзію, плутонію, "камунізмію".

І вось тут, выхаваныя любоўю да Беларусі, за людзей і праўду ўзняліся яны, павялі за сабой тых, хто мог і хацеў пачуць, утвараючы з роднасных душ Народны фронт. Тыя дні злучылі іх настолькі, што час ад часу, гледзячы на іх, слухаючы іх размову, думаеш, што так могуць разумець адзін аднаго толькі сын і бацька.

Дзякуючы Быкаву і Пазьняку Беларусь зведала праўду пра смяротную радыяцыйную небяспеку. Узняліся народныя хвалі пратэсту, пачалося выратаванне нацыі. Фронт вывозіў дзяцей з зоны за мяжу, ваяваў за перасяленне, за пакаранне хлуслівых кіраўнікоў. Але не драмала арда чыноўнікаў Кебіча: многія з іх за народныя грошы, выдаткаваныя на будаўніцтва жылля ахвярам ЧАЭС, будавалі сабе катэджы-палацы. На долары, што зарабілі на заводах рабочыя, на якія неабходна было купіць лекі, жонка Кебіча і чыноўнікі яго ўрада куплялі, напрыклад, аправы для акуляраў. І ўсё гэта пад акампанемент "згоды" Шушкевіча.

І зноў Пазьняк уздымаў Фронт на барацьбу з карупцыяй: фронтаўцы правялі скрупулёзныя даследаванні карупцыі. Неабвержна даказалі карумпіраванасць шэрагу ўрадавых чыноўнікаў. Прымусілі Вярхоўны Савет стварыць Камісію па барацьбе з карупцыяй. Але даклад дэпутата Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, сябра Фронту С.Антончыка з неабвержнымі доказамі карупцыі да народа так і не быў даведзены. Як калісьці даклад Хрушчова пра жудасныя злачынствы Сталіна супраць свайго народа. Затое Лукашэнку з яго недаследаванымі фактамі рэкламавалі ўсе сродкі масавай інфармацыі. Бо каманда Кебіча наперад прыкінула, што дакументы Народнага фронту абвергнуць немагчыма. І таму іх трэба замоўчваць. А вось дакументы Лукашэнкі — часткова "ліпа", часткова ўжо былі вядомыя раней.

Так і "прыхлопнулі" камісію Лукашэнкі, а Народны фронт працягвае раскрываць карупцыю. "Карупцыянеры павінны сядзець у турме, а не кіраваць дзяржавай". І мы іх пасадзім!" — заявіў Пазьняк.

Што аб'ядноўвае Пазьняка і Быкава? Шанаванне продкаў. Яны ўпэўнены, што народ, які не ведае, не шануе продкаў, загіне.

30 кастрычніка 1988 года Пазьняк павёў людзей на могілкі, каб ушанаваць памяць тых, хто загінуў за вызваленне Беларусі ад фашызму, тых, хто і не пахаваны. Звыш 100 тысяч салдат Вялікай Айчыннай вайны не пахаваныя і па сённяшні дзень. Людзі шлі шанаваць памяць тых, хто загінуў ад сталінскіх катаў і каго штабялямі звалілі ў ямы нелюдзі. Шлях, па якому вёў Пазьняк аднадумцаў, быў вельмі незвычайным. Гэта быў не проста шлях да продкаў. Тым шляхам Пазьняк адных адводзіў ад страху, другіх вёў ад рабства да свабоды, трэціх — праз адукацыйны лабірынт да нацыянальнай свядомасці. Адміністрацыйна-інфармацыйны таталітарызм, адчуўшы сваю пагібель, зразумеўшы, што людзі ідуць за Пазьняком, накінуўся з дубінкамі і газам на яго і яго сяброў. Сістэма вельмі спадзявалася, што яны адкажуць ударам на ўдар, але Пазьняк заклікаў сяброў усе свае сілы і волю скіраваць на тое, каб стрымаць у сабе агрэсію, бо толькі так [illegible] СІСТЭМА. І сталі яны не калекамі, і родная зямля дала ім моц, каб [illegible]. Яны дайшлі.

Ва ўступным слове да кнігі "Зянон Пазьняк: сапраўднае аблічча" Васіль Быкаў пісаў: "...Пазьняк не саступіў са свае паэцкі прынцыповасці. Ён той, хто ў тым памятным дзень 30 кастрычніка 1988 года ва Ўсходніх могілках, дзе народ Беларусі ў чарговы раз атрымаў красамоўны адказ на пытанне: што такое ягоная партыя камуністаў? і як яна ставіцца да інтарэсаў народа. Нахабнае журло не кіраўніцтва тады пагроза насунулася на і без таго мізэрныя рэшткі нацыянальных традыцый і палітычнай сілай нанесла нязмыўную знявагу народу. І калі справа абмілася без крыві, дык у тым вялікая заслуга менавіта Зянона Пазьняка. Гэта ён у самы крытычны момант сутычкі заклікаў шматтысячны натоўп мінчукоў да спакою і вытрымкі, каб не даць [illegible] выгнаць і прайсці за межы Менска ў Курапаты. Не зважаючы на палітычную расправу, на газы і бальшавіцкія "дэмакратызатары", людзі стрымалі сябе, і ён адзін сустрэч не аказалі супраціўлення. Мусіць, у той момант і ў тых варунках гэта было адзіна правільна. Метад вялікага Гандзі таксама тоіць немалую, а часам і рашаючую сілу".

Калі сёння вы, грамадзяне, маеце ў календары святочны дзень, у які можаце паехаць да сваіх продкаў, ведайце: шлях туды гэтае свята праклаў для вас Пазьняк са сваімі паплечнікамі. Калі прыйдзеце на магілы дзядоў, бацькоў, родных, успомніце: гэты магчымасць рыхтаваў Пазьняк з паплечнікамі. І шлях гэты быў ахутаны слезацечным газам, перакрыжаваны міліцэйскімі дубінкамі.

Палітыка — дзіўная, незразумелая для большасці з нас справа. Адны стваралі ГУЛАГі ды зоны і даказвалі: гэта ўсё правільна, што ўсё дзеля народа для светлай будучыні і справядлівага грамадства. А такія, як Быкаў і Пазьняк, спачатку вядуць чалавека ў глыбіню яго душы, дапамагаюць раскрыць яе таямніцы. Вядуць у глыбіню яго гісторыі, а потым раптам чалавек адчувае сябе ЧАЛАВЕКАМ, сугучна ідэалагічных хлусні спадае з яго вачэй, і ён даходзіць сам да простай, геніяльна простай ісціны: вось гэта кавалак зямлі належыць яму і ягоным продкам, і ніхто, акрамя яго, не зробіць гэтую зямлю квітнеючай... І тады, стаўшы, урэшце, вольным, чалавек разумее, куды яму ісці, дзе свабода, а дзе рабства.

Дзякуючы намаганням лепшых прадстаўнікоў інтэлігенцыі, людзі пачынаюць і бачыць, і разумець. Апошнім часам Пазьняк часта сустракаецца з ветэранамі, удзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны. Зянон Станіслававіч вырашыў не святкаваць свой юбілей асобна, а адзначыць яго разам з 50-годдзем Перамогі. Так! Яно ўсё ягонае. Пяцьдзесят гадоў таму, як загінуў бацька ў разведцы боем — гэта для Зянона і смутак, і гонар. І, як спяваецца, "радасць со слезами на глазах". Гэты незвычайны юбілей невыпадковы. Такое ягонае жыццё, у якім усё асабістае непарыўна звязана з лёсам Беларусі. А любіць — значыць імкнуцца да абсалютнага зліцця з любімай. Пасля сустрэч Пазьняка з ветэранамі ўсё часцей даводзіцца чуць: "Дык ён жа зусім не такі, як нам яго падносілі афіцыйныя сродкі масавай інфармацыі. Вось гэта мужык! Дык ён ж за ідэю, за Радзіму жыццё аддасць". А камуністы, з якімі ён вадзіўся размаўляе, горка шкадаваў: "Як нам не хапае такога лідэра, як Пазьняк — адданага ідэі і таленавітага палітыка! Ягонае жыццё — бясконцая разведка боем, ён увесь час на пярэднім краі. І тое новае, што ён адкрывае для людзей Беларусі, для ўсіх спачатку афіцыйная прапаганда б'е ўсё, праз некаторы час уваходзіць у наша жыццё, робіцца законам ці адроджанай традыцыяй.

Калі вы раптам зойдзеце ў штабкватэру БНФ, то будзеце вельмі здзіўлены. Увесь час там шмат людзей: адны заходзяць, другія выходзяць, нешта абмяркоўваюць. І — цішыня! Больш за ўсё шумяць камп'ютэры. Лепшыя эканамісты, палітолагі, аграрыі распрацоўваюць і карэкціруюць сацыяльна-эканамічныя праграмы развіцця Беларусі. Як і раней, калі да кіраўніцтва не дапускаліся не адданыя камуністычнай ідэі і свайму начальству людзі, так сёння былы камуністычны ЦК не падпускае таленавітых маладых спецыялістаў да выратавання Беларусі. Но ўсё гэтыя таленты групуюцца вакол Зянона Станіслававіча. І ім створана ўнікальная эканамічная праграма, вельмі эфектыўная, як прызнаюць сусветна вядомыя спецыялісты. І ў любы момант гэтыя таленавітыя хлопцы гатовыя змяніць эканамічны курс дзяржавы, скіраваць яе ў Еўропу. У той час, як афіцыйная прапаганда плявузгае: "Каму мы патрэбны на Захадзе?", са штаб-кватэры амаль не выходзяць здымачныя групы буйнейшых тэлекампаній свету. Пры мне толькі ад'ехалі японцы, а ўжо прыладжвалі апаратуру амерыканцы з Сі-эн-эн. Паслы многіх краін свету пастаянна просяць сустрэчы з Пазьняком. І я быў сведкам, калі ён перанёс запланаваную палітычную сустрэчу, бо ехаў па запрашэнню на спатканне з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны ў Бараўлянскі шпіталь.

Па сутнасці, у Мінску дзейнічае паралельная ўлада. На чале з Зянонам Пазьняком. Іх мэта: зрабіць жыццё на Беларусі лепшым, чым у Германіі. Гэта задача N 1. "Нас жа цягнуць у зону, дзе спыняюцца заводы і фабрыкі, дзе па некалькі месяцаў рабочыя не атрымліваюць зарплату, дзе галоўны герой — мафіёзі! Сённяшняе кіраўніцтва хутка ператворыць Беларусь у канцэнтрацыйны лагер, дзе камандаваць будуць "крымінальнікі", а на "драўляных" рублі можна будзе купіць міску пахлёбкі", — лічыць Пазьняк.

А ж ці так не ўсе разумеюць. Пакуль сярод нас шмат тых, хто хоча жыць ці пры чарнобыльскім сацыялізме, ці пры ельцынскім капіталізме. Але ці падзякуюць за гэта дзеці?

Ці захочам мы "людзьмі звацца"? "Захочам!" — упэўнены Пазьняк. — На Беларусі не толькі вельмі працавіты народ, але і мудры. Людзі абавязкова зразумеюць, хто ім жыць".

Ёсць і яшчэ унікальная рыса ў Пазьняка і Быкава. Яны — стваральнікі. Усе апошнія 76 гадоў на Беларусі панавалі тыя, хто кіраваўся прынцыпам: "Весь мир насилья мы разрушим до основанья, а затем — мы наш, мы новый мир построим, кто был ничем, тот станет всем". І разбуралі — спачатку законна абраную ўладу, потым прадвітых людзей, затым гісторыю, царквы, вынішчалі мараль і культуру, а кіраваць паставілі тых, хто за ўсіх нагоду лічыцца "нічэм".

Быкаў стварыў сапраўдную гісторыю Вялікай Айчыннай вайны. Пазьняк даказаў, што Беларусь была такім жа ГУЛАГам, як і той, адкрыты для нас Салжаніцыным. Яны абодва пасадзілі ў наменклатурны забаранены зерне будучыні, назва якой — квітнеючая Беларусь. І сёння пра гэтую Беларусь, якую абараняе Беларускі народны фронт, ведае кожны грамадзянін. "Фронт выратаваў людзей ад бяспамяцтва, — кажа Пазьняк. — Фронт выратаваў людзей ад чарнобыльскай смерці, зараз мы змагаемся з карупцыяй. І галоўнае для нас — каб Беларусь стала квітнеючай". Любіць — значыць верыць. Кожную раніцу Пазьняк пачынае з малітвы:

"Ойча наш, каторы ёсць у небе. Свяціся імя Твае. Прыйдзі валадарства Твае. Будзь воля Твая як на небе, так і на зямлі. Хлеба нашага штодзённага дай нам сёння. І адпусці нам правіны нашы, як і мы адпускаем вінаватым нашым. І не ўводзь нас у спакусу, але збаў нас ад злога. Амін".

І Пазьняк верыць, што Бог прыйдзе на шматпакутную зямлю Беларусі.

Фота Уладзіміра КАРМІЛКІНА.

Пастанова Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Аб асноўных мерапрыемствах па падрыхтоўцы і правядзенню святкавання 50-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў

Прэзідыум Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь **пастанаўляе**:

1. Адзначыць, што прынятыя Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь 31 снежня 1993 года пастанова "Аб мерапрыемствах па святкаванню 50-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў" і прапановы Рэспубліканскай камісіі ў асноўным выконваюцца.

2. Пагадзіцца з прапановамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, Рэспубліканскай камісіі і Мінскага гарвыканкама аб запрашэнні на святкаванне 50-годдзя вызвалення рэспублікі афіцыйных дэлегацый краін СНД і Прыбалтыкі, гарадоў-герояў і сталіц саюзных рэспублік былога СССР, воінскіх часцей, якія носяць назвы "Мінскія", асобных былых арганізатараў партызанскага руху ў гады вайны і ўдзельнікаў вызвалення Беларусі з краін далёкага і блізкага замежжа.

3. Прапанаваць Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, аблвыканкамам і Мінскаму гарвыканкаму, гаррайвыканкамам, кіраўнікам прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў, калгасаў і саўгасаў да 1 чэрвеня 1994 года завяршыць абследаванне адзінокіх і маючых вострую патрэбу ў паляпшэнні ўмоў жыцця ўдзельнікаў вайны і працаўнікоў тылу, аказаць ім неабходную дапамогу.

4. Даручыць старшыням выканкамаў гарадскіх і раённых Саветаў народных дэпутатаў сумесна з ваенкаматамі напярэдадні свята ва ўрачыстай абстаноўцы ад імя Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь і Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь уручыць юбілейны памятны знак удзельнікам вайны і асобам, узнагароджаным ордэнамі і медалямі за самаадданую працу і бездакорную службу ў тыле ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

5. Прапанаваць выступіць з дакладам на ўрачыстым пасяджэнні ў горадзе Мінску, прысвечаным 50-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, Старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь М.І.Грыбу.

6. Рэкамендаваць пасольствам Рэспублікі Беларусь у краінах СНД і Прыбалтыкі арганізаваць сустрэчы з ветэранамі вайны, якія прымалі ўдзел у вызваленні Беларусі.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь М.ГРЫБ.

26 красавіка 1994 г. г.Мінск. № 2979-XII

Заявление

Кто взял на себя позорную роль политического цензора?

В марте 1994 года Министерство иностранных дел Беларуси без объяснения причин отказало в аккредитации корреспонденту российской газеты "Известия" Александру Старикевичу. На этом основании журналиста не допускают на официальные пресс-конференции, чинят другие препятствия в работе — его лишают возможности исполнять профессиональный долг.

Это грубейшее нарушение свободы слова происходило именно в те дни, когда парламент страны принимал новую Конституцию. Власть предержащие открыто демонстрируют свое отношение к конституционным гарантиям прав и свобод человека. Внешнеполитическое ведомство Беларуси взяло на себя позорную роль политического цензора. Журналист — посол своих читателей, именно они, а не Министерство иностранных дел, должны определять степень его объективности. Действия в отношении Александра Старикевича противоречат Закону о печати, международным обязательствам по правам человека и коммуникации, взятым на себя Беларусью.

Руководители Беларуси нередко заявляют о своих добрых чувствах к России. Отказ аккредитовать корреспондента старейшей и уважаемой российской газеты вызывает серьезные сомнения в искренности этих заявлений.

Мы выражаем солидарность с нашим коллегой и решительно протестуем против лишения его права свободно искать, получать и распространять информацию. Мы надеемся, что у белорусских властей хватит разума не позорить свою страну и дать возможность Александру Старикевичу беспрепятственно исполнять свои профессиональные обязанности.

Юрий ДРАКОХРУСТ (русская служба радио "Свобода")
Роман ЯКОВЛЕВСКИЙ (российское агентство "Постфактум")
Виталий ТАРАС (корреспондент "Общей газеты")
Валерий КАЛИНОВСКИЙ (корреспондент газеты "Звязда")
Игорь СИНЯКЕВИЧ (корреспондент агентства Франс Пресс)
Вячеслав ХОДОСОВСКИЙ (зав. Белорусским отделением РИА "Новости")
Вера ПОЛЛО (РИА "Новости")
Галина АЙЗЕНШТАТ (белорусская служба радио "Свобода")
Виктор ДЯТЛИКОВИЧ (Балтийская служба новостей, информагентство "БелаПАН")
Макс ИВАШИН (обозреватель газеты "Знамя юности")
Валентин ЖДАНКО (обозреватель газеты "Звязда", корреспондент газеты "Сегодня")
Юрий СВИРКО (корреспондент "Радио России" и латвийской газеты "Дыэна")
Виталий ЦЫГАНКОВ (корреспондент газеты "Звязда")
Уршула МИКОЛАЙЧИК (корреспондент Польского агентства печати)
Сергей ПЛЫТКЕВИЧ (политический обозреватель "Народной газеты")
Татьяна ЩЕБЕТ (российский еженедельник "Век")
Александр МИХАЛЬЧУК (зам.гл. редактора "Белорусской деловой газеты")

Государство против личности

Забрали последнюю надежду

Виктор ХОРОШКО

Сколько радости, помнится, принесло в начале 1993 года бесквартирным семьям постановление Совета Министров, которое разрешило в городах республики создавать жилищно-строительные комплексы. И у людей побогаче, и у совсем малоимущих засветилась надежда заполучить наконец свой уголок.

Как и где находил каждый бесквартирный гражданин Беларуси деньги для "стройки века", известно только ему одному. Но то, что благородная идея в итоге обернулась многотысячным горем, должно вызывать головную боль у государственных мужей. Ведь не кто иной, как родное государство в очередной раз проливает слезы многих тысяч наших сограждан.

Приведу всего один конкретный пример из десятков, которые так или иначе стали известны редакции.

Итак, Бобруйск. Не успело постановление Совмина прибыть в город, как горисполком дал указание своим управлениям сформировать ЖСК. При этом членами формирования должны были стать только инвалиды войны, ветераны, семьи погибших, воины-интернационалисты, чернобыльцы, учителя и медики. Но данные категории людей в нашем обществе наименее платежеспособны. Потому ЖСК сформировался только к августу 1993 года.

Дальше все пошло как по маслу: собрание, регистрация, договоры, первые паевые взносы. И... стоп машина, когда дело коснулось кредитов. Средств на это у банка не оказалось, хотя в последней инстанции и обнадежили: "Будут деньги — дадим!"

Но в это время заартачились в УКСе: "Нечем платить? Забираем дом".

